


# СКАНВОРД

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Гудок. Авеню. Рапіра. Амар. Юрта. Гусар. Грыб. Дача. Спас. Рыф. Шып. Абак. Цукар. Дама. Анабас. Пірог. Рана.
**Па вертыкалі:** Града. Дзеці. Каюта. Рынг. Плюс. Рэтра. Мір. Рэбус. Рада. Унты. Гаспадар. Атаман. Факір. Шэраг. Баба. Каса. Цяп.

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.58 | 20.20 | 14.22 |
| Віцебск — | 5.44 | 20.13 | 14.29 |
| Магілёў — | 5.48 | 20.10 | 14.22 |
| Гомель — | 5.49 | 20.03 | 14.14 |
| Гродна — | 6.13 | 20.35 | 14.22 |
| Брэст — | 6.18 | 20.31 | 14.13 |

## Месяц

*Маладзік 16 красавіка. Месяц у сузор'і Рака.*

## Імяніны

*Пр. Акуліны, Гаўрылы, Георгія, Данілы.*
*К. Агнешкі, Амаліі, Тэадора, Часлава, Шымана.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**20 КРАСАВІКА**




**1906** год — у маёнтку Пятроўшчына каля Мінска адбылася адзін з першых тэатральных паказаў на беларускай мове. Пастаўлена была перакладзеная з украінскай на беларускую камедыя М. Крапіўніцкага «Па рэвізіі». Арганізавалі пастаноўку Аляксандр Бурбіс, пазней вядомы тэатральны і палітычны дзеяч, і Аляксандр Уласаў, будучы рэдактар «Нашай нівы». Тады ж упершыню публічна прагучалі яшчэ не апублікаваныя вершы Янкі Купалы «Што ты спіш?», «Не рвіся к багатым», «Пашкадуй мужыка!» у выкананні Аляксандра Бурбіса. Паколькі беларускамоўнае прадстаўленне было справай небяспечнай, усе акцёры выступалі пад псеўданімамі. Прысутнічала больш за 300 гледачоў. Для парабкаў і сялян уваход быў вольны.

**1908** год — нарадзіўся (г. Дуброўна) Якаў Шур, савецкі фізік, член-карэспандэнт АН СССР, адзін са стваральнікаў уральскай навуковай школы магнітолагаў. Аўтар навуковых прац па фізіцы магнітных з'яў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1967). Памёр у 1986 годзе.

**1915** год — нарадзіўся (Расія) Павел Фёдаравіч Вансецкі, Герой Савецкага Саюза. Беларус. З 1938 года — у ВМФ, служыў на Чарнаморскім флоце. З 1942-га — у марской пяхоце, удзельнік дэсантных аперацый у Новарасійску, Марыупалі, Таганрогу, Бярдзянску. Вызначыўся падчас дэсантнай аперацыі каля горада Нікалаеў (Украіна): у ноч на 26 сакавіка 1944 г. атрад дэсантнікаў, у складзе якога быў і Вансецкі, па Паўднёвым Бугу зайшоў у тыл ворага і высадзіўся ў порце, у няроўным баі за двое сутак адбіў 18 контратак, нанёс вялікія страты праціўніку. Загінуў у гэтым баі.




**1927** год — нарадзіўся Павел Барысавіч Луспекаеў, расійскі савецкі акцёр, заслужаны артыст РСФСР. У фільме «Белае сонца пустыні» выканаў ролю Верашчагіна. Здымаўся ў карцінах «Цягнік міласэрнасці», «Доўгае шчаслівае жыццё», «Такая доўгая, доўгая дарога», «Жыццё Мацвея Кажамякіна» і іншых. Памёр у 1970 годзе.

**1933** год — выдавецтва «Маладая гвардыя» з ініцыятывы А. М. Горкага пачало выпуск першай універсальнай біяграфічнай серыі «Жыццё выдатных людзей». У гэты дзень выйшла ў свет першая кніга серыі — «Генрых Гейнэ» А. І. Дэйча.



**1942** год — адбыўся першы палёт серыйнага франтавога знішчальніка Ла-5 — аднаго з асноўных савецкіх знішчальнікаў часоў Другой сусветнай вайны. На гэтым самалёце адкрыў свой баявы рахунак славуты ас, тройчы Герой Савецкага Саюза І. М. Кажадуб, які збіў на гэтай баявой машыне 45 самалётаў праціўніка.

**1958** год — нарадзіўся Вячаслаў Аляксандравіч Фяцісаў, савецкі спартсмен, хакеіст, заслужаны майстар спорту па хакеі з шайбай, заслужаны трэнер Расіі, трохразовы алімпійскі чэмпіён, сямікратны чэмпіён свету.

## УСМІХНЕМСЯ

Жонка мужу, сумна:
— Вясна прыйшла, на вуліцы цёпла, добра, а мне распранацца няма ў што.

**З тлумачальнай запіскі дворніка:**
**«Я зусім не быў п'яны ў канцы змены ў пятніцу. А ляжаў на газоне і еў траву таму, што зламалася каса, а план трэба было выканаць».**

— Чым зараз займаешся?
— Палітычны аглядальнік, спартыўны каментатар, кінакрытык.
— Выйшаў на пенсію?
— Так.

**— Алё, міліцыя! Мяне выкралі іншапланецяне!**
**— Вы п'яны?**
**— Так, але гэта так сума.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1467.
Нумар падпісаны ў 19.30 19 красавіка 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12